ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

Цэна асобнага № 25 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

За 1 м	За 2 м	За 3 м	За 4 м	За 5 м	За 6 м	За 7 м	За 8 м	За 9 м
1 р.	2 р.	3 р.	4 р.	5 р.	6 р.	7 р.	8 р.	9 р.

Падпіска прымаецца толькі с 1-го чысла кожнаго месяца.

Перамена адрэсу - 50 кап. Пры зьмені адрэсу конча прыкладаць стары адрэс.

Рукапісы павінны быць чытэльна дапісаны і толькі з аднаго боку паперы. Кепска перапісаныя рукапісы ні чытацца, ні друкавацца ні будуць.

На ліставанне, перасылку рукапісау і іншыя адказы—павінны прыкладацца маркі.

Газэта палітычная, эканамічная і літэратурная.

ГОД ВЫДАННЯ I.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Мінск, Захараўск. 18.

Умовы друку абвестак:

(На IV боку газэты) за 1 радок шпальту 40 к. за 2 рад. 80 к. за кожны раз.

Асобам, шукаючым працы—1 руб. за 3 радкі адзін раз.

№ 32 1917 г. Чэцьвер 30 лістапада 1917 г. № 32

Роднаму краю.

Знае толькі Бог едыны,
Як мне любы лугавіны
І родныя межы—
Стужкі поля—і дарогі,
Пустак немыя разлогі,
І курганы—вежы;
Як мне мілы тыя хаты,
Дзе красуе мох калматы
На старэнькай стрэсі,
Гоман ніў благенькіх у полі,
Скібы вузкія і ролі,
Пташак сьпеў на лесі.
Знае Бог адзін, як мілы
Мне мужычыя магілы
І той крыж дрэўляны,
Пад каторым косьці тлеюць,
Дзе бярозкі зелянеюць
І на дол пешчаны
Майскім ранком сьлезы роняць,
І галінкі ціха клоняць,
І шумяць маркотна.
Там я вырас, узгадаваўся,
Дзе спрадвеку заснаваўся
І бруіць дрыготна
Жаль вялікі і пакута,
Дзе пануе горо люто
І нудзьга разьліта.
І я зросся з гэтым горам,
Як віхрэ-вятрэ с прасторам,
Як з загонам жыто.
А як песьню засьпеваю
Аб зьнішчалым нашым краю,
Я ні волен над сабою:
Сьпеў мешаецца с сьлязою,
Плачам аддаецца.
Ніхай стогне, ніхай плачэ,
Покі жыцце стане начэ
І скрозь цемрадзь і гушчары,
Як луч сонейка праз хмары
Сьвет нам ні прарвецца.

Якуб Колас.

Пагоня.*)

(Пасьмертны верш).

Як толькі у сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах,
Успомню Вострую Браму сьвятую
І воякаў на грозных канях.

У белай пені праносяцца коні,—
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць,
Стародаўнай Літоўскай Пагоні
Ні разбіць, ні спыніць, ні стрымаць.
У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі—годы...
Вы за кім у пагоню сьпяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?
Мо' яны, Беларусь, панясьліся
За тваімі дзяцьмі у здагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі й аддалі ў палон?
Бійце ў сэрцы іх—бійце мячамі
Ні давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрцо начамі
Аб радзімай старонцы баліць...
Маці родная, Маці-Краіна!
Ні усьцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына
За Цябе яму ўмерці дазволь!..
Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...—
Стародаўнай Літоўскай Пагоні
Ні разбіць, ні спыніць, ні стрымаць...

Максім Богдановіч.

*) Гэрб В. Князьства Літоуска-Беларускаго

Нашыя адносіны да агульнадзяржаўнаго Сойму.

Украінскі публіцыста Я. Маеускі, напісау дужа цікавую брашуру на тэмат «Загальноросійскі Установчі Збори.» Зьмест гэтае брашуры паслужыць нам матэрыялам для нашаго артыкулу. Сам аутар скрозь кіраваўся інтэрэсамі і патрэбамі свае бацькаушчыны, Украіны, а мы с свайго боку, зрабіушы дзе-якія уласныя увагі, прыстасуем пагляды аутара да патрэб нашаго краю.

Апошні перапіс насялення расійскай дзяржавы адбыуся у 1897 г. С таго часу агульнадзяржаўнаго перапісу ні было, але дзе-якія мейсцовыя спробы перапісу рабіліся, і вось па гэтым спробам можна рахаваць, што за 20 год у Расіі пабольшылося людзей на 40%; такім чынам, калі ні рахаваць Польшчы і Фінляндзіі, то с 115 мільенаў душ стало 161 мільен. Разумеяцца, паказаную ліцбу трэба рахаваць больш-меньш пэўнай.

Калі узяць на рахунак лік людзей паводлуг апошняго перапісу і дабавіць туды 40% прыросту, то мяркуючы, колькі ад якога народу Расіі пойдзе дэпутатау у Сойм, саставіцца гэтакая таблічка. (Нівялічкія народнасьці, як якуты, самаеды, тунгузы на рахунак ні йдуць)

Народы Расіі.	Лік у тысячах.	Лік прэдстаўнікоу у Сойміі (1:200000.)
Вялікарусы	77942	390
Украінцы	31381	137
Беларусы	10240	51
Жыды	7088	35
Кіргізы	5717	29
Татары	5233	26
Немцы	2506	13
Літоўцы і Жмудзіны	2321	12
Башкіры	2014	10
Латышы	2010	10
Грузіны	1892	10
Армяны	1635	8
Малдаваны	1570	8
Мордва	1436	7
Эсты	1404	7
Сарты	1356	7
Чувашы	1181	6
Узбекі	1017	5
Каўказск. горцы	1528	7
Разам .	159368	778

Па рахунку камісіі па справам выбароў да Установчаго Сойму усіх дэпутатау павінна быць каля 800 чалавек. Да гэтаго ліку трэба дадаць душ колькі ад тых мейсц, якім (напрыклад, абедзвім расійскім сталіцам) па тым ці іншым увагам, будзе падано права паслаць ліпшняго дэпутата.

Для нас, беларусау, як і для іншых нідзяржаўных нацыяў, найбольшае значэнне мае пытанне пра тое, колькі дэпутатау будзе абстаіваць фэдэрацыю і колькі за унітарную рэспубліку. Разумеяцца, напэўна сказаць гэтаго нельга, але узяўшы пад увагу заявы, зробляныя нацыянальнымі арганізацыямі розных народау Расіі і іх нахіл у бок фэдэрацыі ці проціў яе, па сколькі ен выяўляуся у друку,—мы маем досыць грунту, каб размежаваць гэтыя народы і іх прэдстаунікау на тры часткі: 1) народы, каторыя будуць дамагацца фэдэрацыі, 2) народы, каторыя будуць праціўіцца фэдэрацыі і 3) народы, адносіны каторых нівядомы. Праціўіцца будуць вялікарусы, жыды і немцы; да народау, каторыя ні выясьнілі сваіх адносін да фэдэрацыйнаго адбудавання Расіі, належаць мардва, чувашы і, наагул, усе нівялічкія нацыі. Усе яны разам будуць мець дэпутатау у Сойміі каля 461 чалавека. Калі вылучыць адгэтуль дэпутатау ад Сібіры і Казацтво, якія, як гэта ціпер выясьнілася, будуць абстаіваць фэдэрацыю, то рэшта пакажа лік тых прэдстаунікоу, што будуць проціў фэдэрацыі. Трэба яшчэ дадаць, што ні усе прэдстаунікі, так званых, нідзяржаўных нацыяў будуць абстаіваць фэдэральны лад дзяржавы. Трэба яшчэ рахавацца с тым, што сярод гэтых дэпутатау шмат знойдзяцца такіх, каторыя разам з расійцамі стануць запэўняць, што мы—ні нацыя, а частка, адна столка маскоускаго народу, што ніякой у нас свае культуры німа і быць ні можа, што мова наша—ні мова, а мешаніна польскіх і маскоускіх слоў, што усе нашае дабро патрэбно Расіі і што, адным словам, мы ні маем права на самабытнае культурнае жыцце. І вось, калі усе гэта заўважыць і падрахаваць, то можым сьмела сказаць, што, на самы лепшы выпадак, у агульнарасійскім Установчым Сойміі прыпадзе 3 антыфэдэралісты на 2 фэдэралістау. А калі так, то агульнадзяржаўны Сойм стане для нас летэрэяй, у якой мы выграем у залежнасьці ад таго, якая зложыцца большасьць—за ці проці фэдэрацыі. Паустае пытанне, *ці маем мы права вырашаць долю Беларусі на летэрэях?* Ці маем мы права, наогул, ставіць пытанне пра долю свае бацькаушчыны у залежнасьць ад таго ці іншаго настрою, або ласкі маскоускаго грамадзянства і прыхільных да яго элементау? Тагды, разумеяцца, нам нічога ні застанецца, як толькі, прызнаушы сябе пакорлівымі, паслушнымі подданцамі Масквы, паслаць да агульнадзяржаўнаго Сойму душ колькі дэпутатау і адтрымаць ад маскоускаго народу тое, што ен захоча нам падароваць, і, адтрымаушы падарунак—нізінька уклоніцца, падзякаваць добраму пану ды потым гоцкацца усе жыцце с панскім падарункам...

Дык ні павінна-ж гэтаго быць! Сапрауды беларус, шчыры прыхільнік свайго народу, адважны борэц за волю свае бацькаушчыны мусіць шчыра, але цьвердa, сказаць свайму брату—вялікарусу, які так пaвабна і солодка заклікае нас да агульдзяржаўнаго Сойму:

— Да гэтаго часу, мой братка, ты валадау мною па праву штыка і нагайкі, а ціпер ты, скінуушы з масю дапамогай цара і маючы штык і нагайку, хочаш адтрымаць у мяне яшчэ і вэксэль праз Сойм, які дасьць табе новае права на маю *землю і волю,*—але я табе гэтаго вэксэля ні дам.

Ты сам абвесьціў на цэлы свет, што усе народы маюць права на самаадзначэнне, што усе маюць права самабытна вырашаць сваю долю; ты прызнаеш, што чэхі, хорваты, позпанцы маюць права вольна выслауляць сваі вольныя бажанія на *сваіх уласных Установчых Соймах,* дзе над імі ніхто ні мае права рабіць ніякога прымусу. І толькі за намі і за нашымі братамі,—украінцамі, літоуцамі і іншымі ты гэтаго права ні прызнаеш; і заміж таго, каб даць спрамогу кожнаму з нас рашаць сваю долю у сябе дома, у сваіх нацыянальных *Установчых Соймах,* ты валаеш нас на агульнадзяржаўны Сойм, дзе ты будзеш у большасьці і будзеш перамогаць усіх нас сваею лічбаю, сваею воляю. Але мы ні пойдзем да цібе у падсуседзі, бо наўперад ведаем, што ты гатуеш для нас на сваем Сойміі у Маскве ці Петраградзі.

Да гэтаго часу мы, дзеля славы твайго народу, аддавалі, ні рахуючы, свае нацыянальнае дабро і кроў сваіх лепшых сыноў. Ты брау нашае багацтво і па дурному траціў яго, без карысьці для каго-б то ні было, навят для сябе. Ты брау нашых дзяцей і заваевывау усе новыя і новыя землі дзеля «славы рускаго оружія» і для утварэння новых пасадау для сваіх чыноунікау, настаунікау і іншых начальнікау-русіфікатароу, для твае дэмакратычнае інтэлегенцыі і твайго мешчанства. Мы, як рабы пад страхам сьмерці, прычыняліся да тваіх разбояу;

мы, як катаржнікі, працавалі на цібе. I што-ж мы бачым ціпер, што мы маем за усе тое? Гвалтоуства, шыбені, рэзьню, безладзе і наругу! Мы былі самым бесправным народам у сьвеці,—ты адабрау у нас усе,—навят нашае імя, нашую школу, нашую мову. Ты казау, што у гэтым вінават ні ты, а правіцельства тваіх цароу. Так!.. Ну, а што дау нам ты посьля таго, як мы дапамаглі табе прагнаць цара і яго кампанію,—посьля таго, як ты стау на Русі справоваць і камандаваць сам?..

Ты ні дау нам роуна нічога ды стау каваць для нас новыя, ямчэйшыя кайданы. Твае міністры сацыялісты і навят твая лепшая дэмакратыя, сабраушыся у рады работніцкіх і салдацкіх дэпутатау, сталі награжаць братом нашым, украінцам, штыкамі, калі яны, паверыушы слову твайму пра самаазначэнне, сталі самі будаваць свае жыцце. Мы чулі, мы бачылі, як ты трос кулакамі і запэуняу нас, што рэвалюцыйная Расія «не откажется от своего достоянія.» I ціпер ты дамагаешся, каб мы паверылі табе ды згадзіліся разам с табою вырашаць сваю долю у тым сойме, дзе ты, згуртаваушы каля сябе большасьць, станеш гэтак сама трасьці кулакамі і награжаць нам штыкамі!..

Брат, брат,—ты вельмі наіуны! Ты ужо занатта паверыу у свае панаванне. Выборы мы зробім, і дзе-хто ад нас пойдзе у Маскву ці Петраград, але, выбачай, ні дзеля таго, каб аддаць на суд твой долю свае айчыны, будучыну Беларусі! Мы мобілізуем свае сілы і праз нашую Вялікую Раду склічам сваіх абраннікау у сэрцы Беларусі і тут выкуем даржаўную волю свайго народу, а ты, наш любы браце, падбай пра тое, каб прыйці з намі да паразумення. Мы потым стрэнямся с табою, ужо, дапрауды, як вольны з вольным і роуны з роуным, і падпішам наш цалюбоуны дагавор аб нашым супольным, фэдэрацыйным жыцці, а покі што—да забачэння.

Мы хочам самі быць гаспадарамі свае Зямлі і свае Волі.

Я. Л.

Тлумачэнне.

Украінскі унівэрсал у зямельнай справі выклікау шмат запытанняу. Як ведама, унівэрсал касуе прыватную уласнасьць на землі памешчыцкія, монастырскія, цэркоуныя, кабінэцкія, удзельныя і іншыя землі ніпрацоуных гаспадарствау сельска-гаспадарскаго значэння. Гэнеральны Сэкрэтарыат, каб ні было памылковаго тлумачэння, уважае конча патрэбным даць паясьненне пра зямельную справу.

У справі зямельнай, як і у іншых, унівэрсал толькі абвесьціу агульныя падставы, што маюць легчы у аснову адпаведных законау, якія павінны вырабіцца у парадку нібауясьці. Скасаванне права уласнасьці на землю трэба разумець так, што права уласнасьці пераходзіць да народу Украінскае Рэспублікі, а значыць, ад дня абвешчэння унівэрсалу да-ціперашнім уласьнікам забаронена землю прадаваць, куплаць, закладаць, даравацьці перадаваць каму-небудзь у уласнасьць тым ці іншым спосабам, бо гэтыя землі лічацца уласнасьцю ні аддзельных асоб ці установау, а усяго народу, пры тым,—гэтае скасаванне уласнасьці, як і увесь зямельны лад на Украіні, мае падцьверджэнне і астаточна установіць Украінскі Устаноучы Сойм.

Да Устаноучага Сойму гэтыя землі перадаюцца пад загад выбраных народам зямельных камітэтау, якія і будуць радкаваць імі на аснові спэцыяльнаго закону, каторы будзе апрацаван. Дзеля гэтаго, сьцерагучы усе народнае гаспадарство: машыны, лясы, будынкі, коні, быдло і інш., дбаючы пра парадак на Украіні, унівэрсал забароняе самавольна захопліваць землі і усселякае дабро, сеч лес і інш., бо такія захопліванні і парубкі німінуча зруйнуюць народнае багатство і выклічуць разрухі і сваркі у краю і сярод селянства. Разам с тым, бярэцца пад апеку інтарэсы служачых і рабочых, што працуюць на эканоміях і іншых гаспадарках сельска-гаспадарскаго характару.

Так само, што датычна пытання даўгоу, якія лежаць на зямлі і сельска гаспадарскіх маентках, а гэтак само пытання пра форму і размер грамадзкай дапамогі тым, хто панес цяжкія страты праз зямельную рэформу, усе гэта мае быць разгледжана і вырашана на Устаноучым Соймі. У унівэрсалі выразна зазначано, што права уласнасьці касуецца толькі на землі ні працоуных гаспадарст, а таму, усе землі працоуных гаспадарак якія-б яны ні былі, ці селянскія ці чые інш., застаюцца у уласнасьці ціперашніх гаспадарау, і што права уласнасьці касуецца на землі с.-гаспад. значэння. Такім чынам, права уласнасьці на землі, якія належаць местам, мястэчкам і селам, або знаходзяцца пад дачамі, сялібамі, агародамі, садамі, пад опытнымі полямі і станцыямі і гэтак сама пад капальнямі, заводамі, фабрыкамі і інш.—ні касуецца. Нагогул, унівэрсал ні толькі ні дае права самавольна распараджацца землямі, або с.-гаспад. прыладамі, коньмі, быдлам і т. д., а прызнаючы яго дабро усенародным, перадае усе пад дагляд і у распараджэнне паветавых і губэрскіх камітэтау пры дапамозі камітэтау валасных.

Газэта „Нова Рада" вуснамі свайго публіцысты К. Мацыевіча, разьбіраючы практычныя вынікі зямельнаго мавіфэсту, паміж іншым, піша: «Маніфэст рашуча касуе уласнасьць на землю усіх ніпрацоуных гаспадарствау і касуе яе у такіх выразах, што ні можа быць жаднаго ваганія, што уласнасьці на гэтыя землі *ужо* ні істнуе. Ні будзем гаварыць пра тое, ці мела Рада права выдаваць такі маніфэст. С пагляду прауна-рэвалюцыйнаго, пэуня ні мела, бо гэта сапрауды такі прэрогатывы Устаноучае Рады. Нават Ленін на гэта ні адважыуся. Пытанне пра гэта мае вялікае практычнае значэнне цераз тое, што калі Устаноучая Рада касуе уласнасьць, то яна мае поунамоцтва знайці для зямлі і «новаго гаспадара.» Унівэрсал, адмяніушы уласнасьць, такога гаспадара знайшоу у «усем працоуным народзі», якога волі мы ні ведаем і каторы ні мае органау для яе выяулення і распараджэния.» Такім чынам. на моцы унівэрсалу, зямля нікому ні належыць. «I калі селяне разумеюць гэта так, што яе можа браць усякі, хто бліжэй, калі яны пачыняюць бойку за землю, варачаючыся да часоу захватна-зямельнаго перыоду, то ні яны вінны у такіх учынках і падзеях.»

Падкрэсьліушы яшчэ колькі большменьш цікавых уваг, ягомасьць К. Мацыевіч зазначае, што у маніфэсьці аб зямлі адбіліся гукі тых ідэй, »якія ніколі нашымі роднымі ні можуць быць,—мы констатуем нахіл да тых пануючых ціпер расійскіх тэндэнцый механічнаго агульнаго урауненя зямлі з яе прымусовою *соцыялізацыяю*, каторыя нам саусім чужыя і уяуляюць с сябе прадукт іншых зямельных умоу і іншаго сельска-гаспадарскаго ладу. I ад таго, ці пацягнемся мы у хвасьце гэтых чужых нам (расійскіх) тэндэнцыяу, ці пойдзім сваім уласным шляхам індывідуальнаго працоунаго гаспадарства, зьеднанаго праз каопэрацыі, залежыць усьпех развязання зямельнаго пытання. Я пэвян у тым, што калі б уселякія вольныя парадчыкі нашаго народу ні мудрылі над яго думкамі і воляю,—для нас магчымы толькі наш шлях, толькі яго прыме жыцце, але тым часам шмат шкоды нашаму краю, шмат нішчасьця нашаму народу прынясе гэтае мудраванне, гэтае адрыванне роднаго грунту дзеля удыгання чужой і прытым старой, аджыушай ідэалегіі.»

Апошняя увага цалкам адносіцца і да тых беларускіх дзеячоу, каторыя пераняли сваю зямельную праграму ад расійскіх С-р. і думаюць прышчапіць прынцыпы вялікарускай абшчыны нашаму народу. Дарэмна думка, марная трата працы і заходау! Што добра расьце у адным мейсцы, то можа згінуць да звання у другом. Ды і тое сказаць, расійская абшчына, на каторай будуецца эсэроуская соцыялізацыя зямлі, да гэтаго часу выяуляла сябе толькі тым, што народ на Маскоушчыні галадау амаль ні кожнае дзісяцілецця. Гаспадарка нашаго селяніна пабудованая на прынцыпі індзівідуалізму, на грунці асобнай, нізалежнай гаспадарнасьці, ні гледзючы на пешчанасьць беларускаго поля, ніколі галадоулі ні знала і ні было такога здарэння, каб дзяржауная казна прыходзіла на дапамогу нашаму селяніну. Толькі на грунці звыклаго для беларуса карыстання зямлею можа быць прадуктыуна развязано зямельнае пытанне.

Я. Л.

Уселякія весткі.

Фауст на украінскуй мові. Адзін гімназіяльны настаўнік у Елісаветградзі, М. Т. Ілесько, прачытаў на спэктаклі вучняў сярэдніх школ некалькі адрыўкаў свайго перакладу на украінскую мову «Фауста» Гэтэ. Пераклад адзначаецца пекнаю, кваціставю моваю і добра адбівае дух аўнэнтыку (арыгіналу). Публіка прымала лектора з энтузіазмам. Яго пераклад яшчэ ні скончан.

Беларускім пісьменнікам так само даўно пара падумаць аб тым, каб перакласьці на беларускую мову у першую чаргу хоць-бы А. Міцкевіча, Сыракомлю, так шчыра кахаўшых наш край і творы каторых тык блізкі сэрцу кожнаго беларуса. I А. Міцкевіч і Сыракомля (Кандратовіч) добра ведалі, што яны родам беларусы; Сыракомля навят напісаў шмат вершаў па-беларуску і, як вядома, вітаў прыход рэвалюцыі 1848 г. вершам па-беларуску, каторы пачынаецца гэтак:

Заходзіць сонцо пагодняго лета,
Веіць вецяр з заходніх нябёс.
Здароў будзь, вецяр! З далёкаго сьвета
Добрыя-ж весьці да нас ты прынёс.
Здаровыя-жбудзьце,-эй,добрыя весьці!
Там на Заходзі праліваюць кроў,
Бьюцца для славы, свабоды і чэсьці
І робяць вольных людзей з мужыкоў...

Вершы Сыракомлі у свой час нехта маніўся выдаць у Варшаві асобнаю кніжкаю. Каліж угледзяць яны сьвет Божы і калі настане той час, што прачытае іх вольны беларускі народ? Нам даводзілася чуць, як адзін інтэлігентны паляк с Польшчы казаў, што ён любуецца прыгожасьцю верша А. Міцкевіча, але творы яго мала гавораць польскаму сэрцу, як, скажам, творы А. Пушкіна мала хвалююць сэрцо беларуса. Трэба вярнуць пісьменнікаў да дому, пераклаў... іх творы на беларускую мову!

Мытрополіт Шэптыцкі у Эуропі.

У м-цы жніуні мытрополіт Шэптыцкі прыехау у Фрайбург, што у Швайцарыі,

Жыцце.

Жывець спакойна вол пад тым ярмом сваім,
Намуляў карк. Мазолі, скрозь мазолі!
Падкінуць сена жмут—яму таго даволі
I лёс мізэрны свой ні назаве благім.
Цярпліва зносіць ён нівыгады жыцця:
Ніхай яго часамі злаюць ліха,
Хай сьвішча страшны біч,—пакорліва і ціха
Ідзе разораю. Кіруе ім дзіця.
Жыві-ж спакойна вол, хадзі ў сваім ярме,
Цягай плугі і лій свой пот на пана,
Хаця ні ведаеш, якая рэч пашана,
— На што яна табе? Сьляпому добра ў цьме,
Лягчэй іці яму дарогаю жабрачай.

А ты—жывёлаў цар? Ці ж ты жывеш іначэй?!..

Алесь Гарун.

Казкі жыцця.

Стары лес.

Гэта быў старасьвецкі лес.

I былі у гэтым лесі такія пушчы і нетры, аб каторых ні ведаў ніхто на сьвеці. Поўны месячык раз у чатэры квадры ўсплываў на сярэдзіну неба і адтуль рыхтаваўся пацікаваць, што дзеяцца пад паветкаю густога веццяя. Але яму лягчэй было разглядзець, што робіцца пад стрэхою у хаці чалавека, чым прабіцца праз галіны адвечных гушчараў. I сумоваў тагды круглы блішчасты месячык і хаваў свой твар у сьветлых хмарках. Само ясное соўнейко ледзьвя-ледзьвя прапускало залатыя косы і то толькі да палавіны, а на самым нізе заўсюды панаваў цянёк і прохладзь. Зьвярэ і пташкі ні мелі адвагі забірацца у самыя нетры леса. Там жыла адна тая Таемнасьць, што запаўняла нетры леса страхамі і нікому нівядомымі дзеямі.

Скрозь гушчары, пад павеццем зялёных голек, прабівалася бліскучая стужка халодной вады і дзяліла пушчу на дзьве часткі. Абодва бераге гэтай рэчкі былі густа заросшы старымі дрэвамі, каторыя кідалі сваё галлё над рэчкаю і лучыліся адны з другімі. I лес па адзін бок рэчкі і лес па другі яе бок такім парадкам быў адным лесом, і тое, што рабілося на адным берэзі рэчкі, было так само справаю лесу другога берэгу,—адным словам, у лесі быў адзін супольны інтэрас, адно жыццё.

Рэчка гэта была нівяліка: у лесі яна пачыналася, у лесі і канчалася,—канчалася пышным і пригожым возяром; вакруг возяра, як вежы, стаялі мудрыя дрэвы — дубэ. У тым ланцугу вельмі важных прычын і зьяваў, праз каторыя выніклі яшчэ важнейшыя дзеі у гэтай пушчы, рэчка займала ні апошняе мейсцо, хоць справядлівасьць вымагае сказаць, што рэчка і ні думала займаць такога мейсца. I яшчэ трэба дадаць, што першыя мейсцы бываюць дваякія: на адны мы самі рымсьцімся, а на другія нас цягнуць, узяўшы за вушы. На гэта апошняе мейсцо ўсьцягнулі і рэчку.

Але сіла ні ў гэтым.

На сьвеці часта бывае так, што самая простая справа, самая ясная праўда пазнаецца цаною вялікай пакуты—натта цяжкая дарога праводзіць да іх спазнання.

Доўгія-доўгія годы, цэлыя вяке, жыла, пушча згодна і шчасьліва, жыла поўным, багатым жыццем.

Але ўсяму на сьвеці ёсьць канец.

На пагорку, нідалёка ад рэчулкі, стаялі купчастыя ліпы, сярод іх прыкідаліся ярко-зялёныя клёны і высокія вязы. Летам на іх высьпевало насенне.

Пад восень прылятаючы сюды вецер падхватваў яго на свае вольныя крылля і разносў па сьвеці. Закінуў раз вецер насенне старой, усімі паважаной ліпы на другі бок рэчкі; прынёс і кінуў на мягкі зялёны мох, па суседзтву з асінай. Асіна замеціла месьцячко, дзе упало ліповае семе. і сумыслу скінула на яго даволі тоўсты сухі свой сук. Сук як раз упаў на насенне і крэпка яго прычавіў. А на заўтра, радом з насеннем ліпы, асіна скінула сваё семячко. Покі ліповае насенне выраблялося с-пад асоваго сука, асіна ўзышла і заглушыла ліпку. Уся гэта справа рабілася на вочах дзятла, каторы дзёўб тут сохнуўшы верх старой хвоі. Дзяцел пераляцеў рэчку, сеў на старую, усімі паважаную ліпу, і разсказаў ёй ўсё, што было з яе насеннем.

— Гэта ужо ні першы раз робіцца так на тым боку рэчкі,—падцьвярдзіў высокі вяз, пакланіўшысь ліпі.

— Гэта чорт ведае што!—ўскіпеў крэпкі граб—саўсім ні па дзервяцкі! Ці ні усё роўна лес? Насення с таго берагу пералетаюць сюды і растуць сярод нас. Унь гляньце: там стаіць бярэзінка, клёны, арэшнік—ўсё гэта націскалося сюды з-за рэчкі!—I глуха зашумела пушча зялёнымі макушкамі. Шум перакінуўся за рэчку, ў другую частку лесу. Злосна зашумеў лес па другі бок рэчкі.

— Нам самім німа тут мейсца! бушавала старая асіна, высока ўзьняўшы круглы верх: — а яны яшчэ сваё племя сюды перэпраўляюць.

— Што казаць!—уторыла вербалозіна.

— Гані іх адгэтуль! — зашумеў ясень: — там стольki прастору, а ім яшчэ мала. Дзе ж самі мы падзенемся?

Доўга шумеў стары лес, падзяліўшысь на дзьве часьці, доўга гаманілі дрэвы, а вялікое ніздаволенне і гнеў чуліся у гэтым гоману.

Каля самых берагоў рэчкі, з аднаго і другога боку, стаялі чародамі алешыны. На прадвесьні, як яшчэ у лесі ляжаў тоўсты пласт сьнегу а рэчка была пад лёдом, кідалі алешыны свае цёмныя зернятккі на лёд, каб вясною рэчка разам з лёдам панесла іх зер-

АД РЭДАКЦЫІ.

Прыпамінаем нашым паважаным падпішчыкам і арганізацыям, каб адаслалі грошы, належныя за падпіску на газэту «Вольная Беларусь».

Усебеларускі з'езд.

Споўняючы волю беларускіх зьездаў—ваенна-служачых заходняго фронту і беларускіх палітычных арганізацый, Выканаўчы Камітэт Вялікай Беларускай Рады назначае на *5 сьнежня 1917 году агульны беларускі з'езд у г. Мінску.* Гэты зьезд павінен выказаць волю народу беларускаго, каторы ні можэ і ні хочэ далей нідбала глядзець на сваю долю у цяперашні грозны і адпаведны момэнт. Зьезд павінен абсудзіць і разважыць справы аб арганізацыі самаабароны абездоленаго беларускаго народу. Зьезд павінен стварыць усімі прызнаную дэмакратычную беларускую краёвую уласьць, якая патраніць выкіраваць народ беларускі на сьветлы шлях будучыны, які дасьць народу зямлю, волю і мір—унутры краю і за яго межамі.

Парадак дня мае быць такі:

1) Міжнароднае становішчо Беларусі (вайна і мір).
2) Зямельная справа.
3) Які мае быць палітычны лад на Беларусі.
4) Стварэнне органу Краевай уласьці.

Пра сваю будучую чыннасьць мытрополіт сказау: «Справа міру саусім ні належыць да кола мае чыннасьці. Я наумысля ні займаюся палітычнымі справамі, каб адтрымаць магчымасьць аддацца аднаму проэкту, каторы ляжыць мне на сэрцы, гэта—зьбліжэнне цэркві заходняй да цэркві усходняй. Праваслауная цэрква перажывае цяпер вялікі крызіс. Праваслаунае духавенство ні ставіцца кепска да вуніяцкае цэркві. Калі трапляюцца дзе-якія перашкоды, дык яны паустаюць з успамінау пра расійскі царызм. Але-ж маю надзею, што вуніяцкая цэрква дапаможа праваслаунай цэркві шчасьліва перажыць крызіс. Дзеля гэтае мэты маю паехаць да Рыму і, калі ні наткнуся на якія перашкоды, то спадзяюся, што хрысціянскія цэркві пададуць добры прыклад для паеднання народау.

Мытрополіт Шэптыцкі хацеу саусім ухіліцца ад палітыкі, каб аддаць сваю працу на паеднанне усходняе цэркві з заходняю. Грэцка-каталіцкая, або вуніяцкая цэркау мае стаць грунтам для злучэння абедзвіх цэркваў. Маючы гэта на мэці, мытрополіт рабіу усе заходы, каб трапіць да Рыму, але італійскае правіцяльство ні згадзілося на переезд Шэптыцкаго да Рыму.

С Швайцарыі мытрополіт вярнууся у Аустрыю. Пабыушы першы раз у Вені, ен паехау ў Альбоў (Львоу) і трапіу туды як раз у трохлетнюю гадаушчыну свайго арэшту расійскімі уласьцямі.

адкуль меуся падацца у Рым, куды яго запрасіу папа. Мытрополіт у Фрайбургу паміж іншым, меу размову з газэтным дапісчыкам, у каторай зазначыу, што вызваленне яго з расійскаго палону сталося праз дамаганне папы і лібэральнасьць новаго ураду у Расіі. Пра Расію мытрополіт выслоВіуся гэтак: «Хто мяне вінаваціць у непрыязьні да Расіі, той мае на увазі, мабыць, гэты край с панованням Бобрынскаго і Еулогія, каторых асудзіла Дума і Расійская рэвалюцыя, а забывае, што сярод расійскаго народу есьць множэства маіх верных, а так само адданых мне сьвяшчэннікау».

ДОПІСЫ.

З Д. арміі.

Беларускі нацыянальны рух у арміі раптоўна выбухнуў стыхійнай сілай. Раптам схамянуліся беларусы і шпарка бяруцца за працу, як бы хочучы нагнаць той змарнованы час с пачатку рэвалюцыі, калі да арганізацыі ні было такога палкаго жадання. 13/хі г. г. адбылося у нашым корпусі сабранне беларусоў ўсяго корпусу, на яком ухваляна думка пра выбары Беларускіх Гурткоў у полках, дывізіях і корпусі. Аднастайне ухвалілі склікаць фронтовы зьезд воіноў беларусоў у г. Кіеві; клапатаць яб гэтым выбралі дэлегацыю у ліку 6 чэл. (4 аф. 2 сал.) На сабранні ясна выявілася думка, што нам канечна патрэбна мець сваё беларускае войско, каб бараніць сваю дарагую Бацькаўшчыну-Беларусь ад разгрому пры дэмобілізацыі і ад апэтытаў тых паноў, каторыя будуць працягіваць на яе сваю лапу, каб раздзеліць яе на некольні шматкоў.

Сабранне прайшло у велькай еднасьці ўсіх сяброў-беларусаў і паходзіло на адну дружную беларускую сямейку.

14/хі 1917 г. С. П—скій.

З Д. арміі.

7/хі г. г. адбылося агульнае сабранне воінаў-беларусаў Н пех. дэвізіі. Гэта ўжо ні першае беларускае сабранне ў нашай дэвізіі с пачатку рэвалюцыі, але толькі першы раз так моцна, так стыхійна выявілася воля у беларусаў да арганізацыі, да абароны свайго нацыянальнаго «я», да працы самому над паляпшэннем свае долі і долі Бацькаўшчыны-Беларусі.

Радасна і горда было гэта бачыць і прачуваць у сваім сэрцы.

Вялікае ўражэнне на ўсё сабранне зрабілі даклады сяброў Н. і А., якія вярнуліся с Петраграду і Масквы, куды яны былі пасланы ад дэвізіі дзеля азнаемлення са справай помачы нашым гаротнікам-уцекачам. З іх слоў выявілося цяжкае становішчо, як матэрьяльнае, так і духоўнае, нашых уцекачоў, раскіданых па чужых краёх, поўнае безладзе, нідбаласьць і безсыстэмнасьць працы ўсіх камітэтаў, прызначаных кіраваць справай помачы уцекачом. І вось тут-то зашчымело у кожнаго сэрцо за нізаслужанную крыўду нашым бацькам і дзецям—уцекачом. Мы чацьверты год пакутуем на раўне з усімі у акопах і маем права трэбаваць, каб бацькі нашы і дзеці мелі апеку і кусок хлеба, а замест гэтаго—паняверка, зьдзек і голад. І абарвалася у сэрцы кожнаго надзея на тых «дабродзеяў», якіх мы чацьвёрты год абараняем ад жорсткаго ворага шчыра і сумленна, як можэ ні адна нацыя з Расіі, так шчыра ні абараняе. Ясна стала, што далей ждаць і надзеяцца на помач «дабродзеяў» нельга, а трэба самым брацца да помачы сваёй бядзе. А каб справа пайшла шпарчэй і добра, трэба нам усім згуртавацца у адну сціслую і моцную сямейку, тагды мы зможым адстаяць свае нацыянальныя, палітычныя, культурныя і эканамічныя патрэбы нашай Бацькаўшчыны-Беларусі.

У вадзін голас згадзіліся выбраць Беларускі Культ. Прасвет. Гурток, які і быў выбраны у ліку 28 чэл. А каб справу арганізацыі пашырыць на ўсю нашу армію, ухвалено, ні адкладаючы, склікаць фронтовы зьезд. 10 міл. беларускі народ падняўся ужо на абарону сваіх правоў і зычна нясецца яго магутны кліч: «Ніхай жыве Вялікая Беларуская Рада!»

«Ніхай жыве Аўтаномія Беларусі!»
«Ніхай жыве Вялікая Вольная Беларусь!»

Салд. С. П—скій.

З Орэнбургу.

Эканамічныя і палітычныя варункі жыцця на нашай бацькаўшчыні зрабілі тое, што, здаецца, німа такога народу (можа быць апроч жыдоў), каторы быўбы так раесеяны па усім абшары Расіі, як нашы браты-беларусы. Досыць ёсьць беларусаў і у нашым горадзі, Орэнбурзе, але нацыянальнае пачуцце сярод іх слабое. Ні павялічыла гэтае пачуцце і спорая хваля уцекачоў-беларусаў, выкінутая вайной з родных сяліб і дакаціўшаяся аж да нашаго гораду, можа быць дзеля таго, што і сярод уцякачоў праве німа сьвядомых сыноў сваей бацькаўшчыны. Большасьць тутэйшых беларусаў лічыць сябе ці палякамі [каталікі], ці расійцамі [праваслаўныя], і, як ні стыдна прызнаць, сароміцца сваей бацькаўшчыны і сваёй роднай мовы. Маленькая грамадка праўдзівых спагадачоў беларускаго руху, як мага, стараецца папырыць нацыянальную сьвядомасьць сярод большасьці, але апроч індэфэрэнтнасьці ўсяго агулу, ў прашкодзі стаіць і нідахват друкаванаго слова—кніг на беларускай мовы. Закінутыя лёсам за тысячы вёрст ад роднай мацеры-Беларусі, тутэйшыя сыны яе, так сама як іх браты па другіх гарадох Расіі, ні толькі ні маюць магчымасьці плянова знаёміцца з роднай літэратурай, але часта ні могуць дастаць і хоць якой нібудзь беларускай кнігі. Памагчы ім у гэтым павінны гурткі у Мінску, Петраградзі і другіх культурных цэнтрах, гдзе друкуюцца кнігі на роднай мове, паведамляючы хоць бы праз нашы газэты, гдзе і якія, можна выпісаць ці купіць беларускія кнігі.

Б. Лагутко.

ХРОНІКА.

◁ Вярхоуны Глаунакамандуючы дазволіу беларусізацыю вялікіх вайсковых частак на фроці.

◁ Глаунакаманд. Заходняго фронту і вярхоуным глаунакамандуючым прап. Крыленко дазволено формірованне у Мінску І-го Беларускаго полка.

◁ 21-го лістапада у памешканю Вялікай Рады адбылося сабранне беларусау пачтовых служачых г. Мінску. Абрано бю-

---

пяткі і засеяла імі свае бераге на краю лесу, дзе было многа прастору і волі. Разложыстая высокая алешына ні адзін раз бачыла, як другая алешына з другога берагу кідала сваё насенне проста ёй пад ногі і сваімі зерняткамі закрывала яе дзетак.

— Ці у цябе німа свайго мейсца, што засыпаеш маё насенне?—са злосьцю спытала першая алешына.

— А чыё гэта племя утрамбавало наш бераг? чыё? Сама б увесь сьвет заняла, а другому і лапінкі шкода, пагібелі на вас німа!—І пашлі вярнуць, і пашлі вярнуць адна на другую. У іх лаянку воткнулі языке і другія абыватэлі лесу, і такая пашла спорка, што птушкі пазлятаілі з сваіх мейсц, і зьвярэ паыскаківалі з лаговішч. Падняўся такі кірмаш, такі гармідар, што ні дай Ты Божэ. За доўгія вяке згоднаго жыцця патрошкі, патрошкі, назбіралося столькі нінавісьці, столькі гневу, крыўды, зайздросьці, зневажэння, што лес грымеў, хадзіў як кіпень ў гаршку, троссся, калаціўся, дрыжаў ад злосьці. Да голасу лесу прылучыўся піск, гвалт птушак, выццё зьвяроў. Звярэ і птушкі так само ўзялі руку сваіх берагоў.

Ад гэтаго шуму, гвалту, лямэнту затросся воздух, закурыўся пыхом сьнег, пушча раскатурхалася, разгайдалася, расшумелася як селянскі сход, і ужо ніякая сіла німагла супакоіць магутную пушчу.

І страшная бура завыла над цёмнаю пушчай. Заскрыпелі, застагналі тоўшчэразныя гладкакомлёвыя хвоі, зліваючыся у жудасны рэў. Густа і жалобна зашумелі кашлатыя яліны, німіласэрна бьючыся лахматымі лапамі; завылі асіны, ліпы, бярозы, клёны і вербы; загулі магутныя дубэ, і громам грымелі іх чорныя жэралэ; зарыгацелі сукастыя вязы і грабы... Усе дрэвы бушавалі сваімі голасамі, а ў агуле вышла такая страшэнная музыка, што здавалося, бы злыя духе пазрываліся з ланцугоў і спраўлялі свае ігрышчо.

І вось, сярод гэтаго гулу, пачуўся трэск — ні стрымаліся крохкія асіны і пасыпаліся, як соль; за імі, як канопді, разам с карэнямі і з грудамі мёрзлай зямлі, западалі яліны, а падаючы, цягнулі за сабою у сьнег і слабейшыя дрэвы; яны гнуліся, шчэпаліся, крышыліся, і толькі камле іх, як свечкі, тырчалі высока у воздусі, сярод выворатоў і зломаных верхавін, што ужо трупамі ляжалі у сьнезі. А пушча ні суніімалася, стагнала, гула, бушавала, плакала злосным плачам: выла гневам і нінавісьцю. Вот шчапіліся два адвечныя асілкі: магутны, прысадзісты, гузаваты, зьвязісты дуб з таўшчэразным і высочэзным вязом. Доўгія годы стаялі яны на розных берагох нішырокой рэчкі, як добрыя суседзі, і крэпкая дружба, ўзгадованная доўгімі годамі, была заўсюды паміж імі. І яны цяпер сьмяртэльныя ворагі! Страшна было глядзець на гэтых асілкоў. Іх крэпкія тоўстыя суке размахіваліся, білі адны аб другіх, ламаліся. Размахнуўся тоўсты высокі вяз і са ўсей сілы грукнуўся аб дуб. Упёрся моцна прысадзісты дуб, і усім крэпкім целом сваім рынуўся на сустрэч вязу—і пышны верх старога вяза з громам абламаўся, на момэнт звіс, затрымаўся у крэпкіх дубовых сукох—і ціха спусьціўся на халодны лёд рэчкі і ценжаром сваім вагнуў яго, праломаў. Клубок жывой вады вырваўся на волю—заплакала рэчка халоднымі сьлязьмі над трупам старога вяза.

— Помста за сьмерць нашаго бацькі-вяза!—зашумеў той бераг рэчкі. Грозна пацяснулі дрэвы на стары дуб.

— Гэй, сюды!—гукнуў другі берэг рэчкі:— ні дамо у крыўду нашаго абаронца!

Замятушыўся лес, і два грозныя вогіры, дзьве сьцяны дрэваў рынуліся адна на другую. Падняўся віхор. Дрэвы зьвіліся ў адзін клубок, скруціліся, зьвярцеліся і пасыпаліся на землю. Глуха застагнала зямля, задрыжалі узгоркі, і лёд патрэскаўся на возеры і рэчцы...

Цэлы дзень і ноч білася пушча, і мейсцо пабоішча выяўляло сабою грозную і жудасную зьяву разбурэння і сьмерці...

Прышла вясна, растаяў сьнег, павеяло цяплом, і зноў пачало абуджацца жыццё. Толькі гэта пушча цяпер выглядала яшчэ нудней. Усюды ляжалі камне, верхавіны, вываратэ, тырчалі высокія пне паломанаго лесу, і толькі, дзе-ні-дзе, на пагорках засталіся рэдзенькія купкі дубоў, нівялічкія кудзеркі старых хвояў. Прылятаілі з выраю птушкі і ні знайходзілі сваіх становішч.

І плакалі сіроты-дрэвы, стоячы над трупамі сваіх родных, сваякоў і знаёмых. А яснае соўнейко грэло так прыветна і цёпла.

— І на што была нам гэтая трасяніна? —казала рэшта пушчы:—ці нам ні хапіло бы мейсца пад ясным соўнейкам? Дзе нашая сіла? дзе краса наша?—

— Каб ні гэта рэчка, каб яна ні падзяліла нас на дзьве часткі, то гэтаго ні здарылося-б,—казалі хвоі.

— Праўда, праўда!—падхапіла ліпа:—з-за яе зьнішчылася пушча.

— Ну, і уцешцеся, калі знайшлі вінаватаго!—адказала сярдзітая Сойка.

Тарас Гушча.

Дарога.

Ад кургана да кургана,
Ад гая да гая
У пяць ніток легла цьмяна
Пуцінка крывая.
То лясок, то луг, то поле,
То лужок зялёны...
Эх, прастор, эх воля, воля!
Эх, балот разгоны!

І куды бяжыш, дарога
Тканка ног і кола?
Ды маўчыш, пуцінка, строга,
Моўчалівы долы
Ну што-ж? далей, гайда далей
За узгоркі тыя...
Ні стрымацца нам: мы-хвалі
Ціхія рэчныя!

Якуб Колас.

ро па скліканню беларускаго зьезду пачтовых служачых.

◁ 21 лістападу у бараку Земскаго Саюзу на Бабруйскай вуліцы адбыуся сход беларусаў-бежэнцаў гэтаго району. Зышлося каля 60-і чалавек. Закладзено бежэнскае каопэратыунае таварыство. На сабраныя грошы 6 тысяч рублеў адчыняецца крамка у бараку. Уцякачы з радасьцяй выслухалі сябрука В. Б. Рады аб організацыі беларусаў дзеля абароны свайго краю. Выбрано праўленне, а так само дэлегаты на бежэнскі зьезд.

◁ 28-го лістапада адбыўся у памешканні Рады зьезд беларусаў воінаў-інвалідаў, а 29-го агульна беларускі бежэнскі зьезд.

◁ 16-го лістападу у Вітебску адбыуся зьезд воінаў-беларусаў Паўночнаго фронту. Зьезд прайшоў жваво с патрыятычна-беларускім пачуццем, ні гледзючы на перашкоды ворагоў беларушчыны. Выбран выканаўчы камітэт. Прыняты пастановы зьезду Заходняго фронту: нацыяналізацыя войска, аутаномія Беларусі і т. д., Так само 17-го лістападу у Смоленску адбыуся сход воінаў-беларусаў і прыняты аналегічныя пастановы.

Новая беларуская газэта.

25-го лістападу у Мінску вышаў першы нумар новае беларускай газэты „Беларуская Рада“ Газэта друкуецца на расійскай мові і мае аддзел прыгожаго пісьменства па-беларуску. Так сама газэта мае друкаваць артыкулы на беларускай мові.

Зазначыўшы, што гэта ні першая спроба выдаваць беларускую газэту на расійскай мові, мы павінны сказаць, што „Беларуская Рада“ выйшла найлепшай спробай. Праўдзіва беларускі характар газэты, яе дэмакратычна-сацыялістычныя артыкулы, поўныя шчыраго закахання у сваю бацькаўшчыну, жаданне самабытнаю росквіту для свайго спакутанаю краю,—радасно хвалюе сэрцо кожнаго беларуса. Мы цьверда спадзяемся, што газэта зацікавіць самыя шырокія колы грамадзянства, і стане тым даўно жаданым сьветачам для беларускае справы, катораго нам ні хватало і патрэба катораго даўно усімі адчувалася.

Вітаемо свайго собрата па працы! Ніхай цешыцца новая беларуская газэта пашанаю і шырокім уплывам сярод нашаго грамадзянства! Ніхай вольнае слово яе яхаю коціцца скрозь і па-за межамі Беларусі, склікаючы параскіданых сыноў нашаго краю дамоў на вялікую працу па адбудованню аутаномнай бацькаўшчыны. Ніхай гучным звонам разносіцца слово яе па родным абшарам, абуджаючы беларускае пачуцце, каб уваскрэсла, ажыла, зацьвіла і закрасовала Вольная Беларусь!

АПОШНІЯ НАВІНЫ.

Наказ Крыленкі пра мір. Апублікован наказ большэвіцкаго глаўнакамандуючаго Крыленкі арміі і флоту за № 3:

«14-го лістапада нашы парлямэнтэры вярнуліся, прывезшы с сабою афіцыяльную адпаведзь нямецкаго глаўнакамандуючаго пра згоду пачаць перагаворы пра мір на усіх фронтах. Другая сустрэча упоўнамочаных абудвых бакоў прызначана на 19-го лістападу. Кожнаго, хто будзе хаваць, або ні дазваляць аповешчаць гэты наказ, аддаю рэвалюцыйнаму суду мейсцовых полкавых камітэтаў без звычайных формальнасьцяў. Наказваю нібаўна прыпыніць перастрэлку і братанне на ўсём фронці. Патрэбна пільна сачыць за ворагам. Баевую чыннасьць пачынаць толькі тагды, калі яе пачне супраціўнік.»

Грознае становішчо на Усходзі. З Уладзівастоку адтрыманы весьці, што японскі консул зьвярнуся да меськаго галавы с прапазыцыяй пусьціць у Уладзівасток дзеля абароны інтэрэсаў чужых падданных японскую міліцыю. Разам с тым, па месту ходзяць чуткі пра японскі дэсант. Настрой трывожны. На Хабароўску ходзяць чуткі, што кітайцы забралі Харбін і што нідалёка ад Уладзівастоку ходзяць японскія і французкія караблі, што амэрыканскі крэйсер прышоў у Уладзівасток.

Дзяржаўная мова на Украіні. Генэральны Сэкрэтарыят мае гэтымі днямі выдаць цыркуляру з выпадку таго, што дзе-якія установы адмаўляюцца разумець дзелавыя паперы, напісаныя па-украінску. У цыркуляры будзе паказано, што на Украіні мова украінская ёсьць дзяржаўная і таму усе дзяржаўныя установы павінны спаўняць свае дзелаводзтва на украінскай мові. Праўда, што украінскае дзелаводство павінно праводзіцца ні раптова, а паволі, паводлуг таго, як гэта магчыма пры ціперашнім стані умення украінскае мовы чыноўнікамі.

Фінансавая справа на Украіні. У Сэкрэтарстві фінансаў адбылося колькі парад у справі абьеднання усіх банкаў на Украіні. С прычыны чутак пра тое, што маюць друкавацца украінскія грошы, сталі спраўна прысылацца грошы с Петраграду і таму патрэбы у друкаванню украінскіх грошай німа. За апошні час да сэкрэтарства падышло многа праэктаў украінскіх грошай.

Золато Румыніі. Паведамляюць, што ў Маскву прыехалі прэдстаўнікі румынскаго міністэрства фінансовых спраў даведацца, што сталося с залатым запасам Румыніі, каторы у свой час перасталі па хованку у Маскву. Ходзяць чуткі, што румынскае золато раскралі падчас маскоўскаго наўстання. Увесь румынскі запас складаецца з 600 мільёнаў франкаў у залатых манэтах рознай вартасьці. На расійскія грошы вартасьць гэтаго золата дасягае 4-х мільярдаў. Увесь гэты скарб для безпечнасьці перавезьлі спачатку у Яссы, а калі нямецкае войско забрало сталіцу—Румынія вывязла сваё золато у Маскву. Апрач таго, у Маскву перавезяно на схову яшчэ цэннасьці вялікіх румынскіх банкіраў, а так само банкі даверылі Маскве шмат папераў, білетаў, дакумэнтаў і іншаго. Калі сцьвердзяцца чуткі пра крадзеж залатога запасу, то Румынія зразу апыніцца зруйнованаю і зьнішчанаю. Гэта будзе страшэнным ударам для румынскіх фінансаў. Гадаюць, што Расія заплаціць за тое, што яна ні магла ухаваць.

Ці праўда, што румынскае золато раскрадзено, нет ведама, а покі што ані як ні можна даведацца, у чыіх руках гэтае золато—ці яно распаўзлося па кішэням большэвікоў, ці можа спакойна ляжыць на мейсцы ды чакае сапраўдных сваіх гаспадароў. Што трапілося з румынскім золатам, хутка стане ведама: гэта утаіцца ні можа.

Камітэт безпекі Украіны. С пагляду на трывожнае становішча у Петроградзі і на можлівасьць эксцэсаў і пагромаў, украінцы арганізовалі камітэт безпекі Украіны, каторы будзе складацца с прэдстаўнікоў украінскай улады, грамадзянскіх арганізацыяў і вайсковых часьцін.

Камітэт ставіць сабе заданнем ні дапускаць арэштаў і трусаў паміж украінцамі. Камісар па справам Украіны даводзіць да ведама тых украінцаў, што прыезджаюць с Петрограду, што асобы, якія бажаюць зарэгістраваць свой украінскі стан, могуць адтрымаць пісанае пасьвэдчэнне і павінны зьвертацца с адпаведнымі докумэнтамі у камісію па рэгістрацыі пры камісару.

Бэсарабскі парлямэнт. У Кішыневі, 24-го лістападу урочысто адчыніўся вярхоўны краёвы орган аўтаномнай Бэсарабіі, Ефетул, Церыі. У склад гэтаго парлямэнту увайшло 450 дэпутатаў усіх нацыянальнасьцяў і партыяў Бэсарабіі.

Украінскія рэліквіі. Рада Народных Камісараў у Петроградзі дазволіла украінцам вывезьці з петроградскіх і маскоўкіх музеяў украінскія нацыянальныя сьвятошчы, што пераховываліся гам за часоў няволі Украіны. Апрач таго, у Петроградзі і Маскве заходзілася на пераховванні шмат уселяхіх надзвычайно каштоўных скарбоў, забраных ні толькі сілаю падчас панования Катарыны II, але і перавезяные туды падчас археолёгічных раскопак.

Нам, беларусам, так само трэба ужыць усіх заходаў, каб вярнуць да дому усе свае гістарычныя рэчы, што апынуліся да Маскоўшчыні ці дзе ў іншым мейсцы. Прыпамятаймо, што было зроблено з нашым Вілянскім Унівэрсітэтам? Хітра ахрысьціўшы яго польскім гнязлом па Беларусі, расійцы разбурылі яго даўзвання, захапіўшы усе навучныя рэчы у свае сталіцы. Ціпер мы ведаем, што зачыняючы Віленскі унівэрсітет, маскоўскі урад руйнаваў ні «польскан гнязло», а вышэйшую навучную інстытуцыю Беларусі, бо як ні клопатало потым грамадзянство, якіх заходаў ні ужывалі, а расійскі урад, адчыняючы унівэрсітэты на Маскоўшчыні, ані як ні згаджауся зрабіць гэта на Беларусі. Ясно, што «польскае гнязло»—адна хітрая адгаворка.

Сібірскі Урад. Аўтаномны Сібірскі Урад забароніў вывозіць хлеб у Эўропэйскую Расію. На чолі сібірскаго ураду стаіць вядомы знаўца Сібіру, Потанін, які жыве у Омску.

Адозва Украінскаго духавенства.

Народзе Украінскі!

Калісьці, яшчэ за Гэтманшчыну, ты быў вольным, але злучыўшыся с царскаю Масквою, ты страціў сваю волю ні толькі дзержаўную, а нават царкоўную. Ціпер адбудаваўшы сваю Народную Рэспубліку, ты меўся адбудававаць нізалежную калісьці ні ад каго, аўтокефальню, сьвятую цэркаў сваю. Прынамсі, трэці Усеукраінскі Вайсковы зьезд зрабіў у гэтай справі пэўную пастанову. Дзеля склікання Усеукраінскаго Цэркоўнаго Сабору, злажыўся «Організацыйны Камітэт, вядомы і Украінскай Цэнтральнай Радзі. Украінскае войско заўсюды было прыхільнікам хрысьціянскай веры ды апекавалося сваей цэркаўю—яно заплаціло за цэльнасьць і нінарушнасьць яе сваей крывёю.

Але расійцы, пазабыўшыся цара сьвецкаго, завялі у сябе новаго самодзержаўца духоўнаго — маскоўскаго патрыарха, каб укінуць наш украінскі народ нанова у духоўную ніволю. Зноў вярнуліся тыя часы, калі людзі ні пытаюцца, як і куды іх паверпуць.

Вольны Народзе Украінскі!

Каб ні напасьці табе у гэтую духоўную ніволю, ты павінен зараз жа склікаць свой Усеукраінскі Праваслаўны Сабор духавенства ды міран, і аднавіць на ім даўнюю ні залежнасьць украінскай Цэркві, пацьвярджаную Перэяслаўскім трактатам (1654 г.) і нізаконна знішчэную Маскоўшчынай.

Дзержаўны народзе украінскі!

Толькі выбраны табою Усеукраінскі Праваслаўны Сабор духавенства ды міран мае право кіраваць справай твае цэркві, ды прызнаць ці ні прызнаць выбранаго цяпер патрыарха маскоўскаго, і дзеля гэтаго ні варта цяпер памінаць яго у цэрквах на Украіні.

Набожны і працавіты народзе украінскі!

Адбудуй сваю вольную аўтокефальную Цэркаў.

Благочэсьцівыя Украінскія Уладыкі, Панойцы, дзіяконы, дзякі, манахі і манахіні! Прыхіліцеся вашай любоўю да грамадзян і ў злучэнні душ і сэрцоў, прыступіце да выбароў прэдстаўнікаў на Усеукраінскі Царкоўны Сабор.

На Усеукраінскі Праваслаўны Сабор духавенства ды міран, што адбудзецца, з ласкі Божай, у Сьвятым Кіеві 28 сьнежня (декабра) 1917 году, маюць прыбыць:

1) Ад кожнай епархіі па аднаму архерэю і ад кожнаго павету па одному панойцу, дзіякону, дзяку і па тры парахвяніна.

2) Ад кожнаго епархіяльнаго гораду: па аднаму панойцу, дзіякону, дзяку і парахвяніну. Апрач таго, ад кожнаго манастыра, мужчынскаго ды жаноцкаго, па аднаму прэдстаўніку.

3) Кожная вайсковая украінская часьць павінна прыслаць па аднаму ваяку, а украінскія часьці Кіеўскай акрузі па трое ваякоў.

4) Кіеўская Духоўная Акадэмія, украінскія сэмінарыі і духоўныя школы павінны прысяаць па аднаму прэдстаўніку.

5) Да Сабору павінны прычыніцца панойцы ўсіх украінскіх вайсковых часьцей.

Увага: Усе прэдстаўнікі павінны быць з роду украінцамі і шчыра прыхільны да украінства, і мець пры сабе ад сваіх выбаршчыкоў належачыя пасьвядчэнні.

Рэдактар Я. Лёсік.

Выдавецтво «Т-во Беларускай Культуры.»

Друкарня Я. А. Грынблата